# Дабрыні і клопату многа не бывае

Першы тыдзень новага навучальнага года стаў ужо гісторыяй. А хлопчыкі і дзяўчынкі прадаўжаюць атрымліваць падарункі. Асабліва хвалюючыя гэтыя дні для першакласнікаў, для якіх пачалося новае жыццё – школьнае. Сярод дзясяткаў першакласнікаў Ляхавіччыны ёсць і рабяты з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі. Дарослыя аб’ядналі намаганні і пастараліся, каб клопат і дапамога такім дзеткам былі адчувальнымі.

*Да Дня ведаў для хлопчыкаў і дзяўчынак падрыхтавалі цікавую праграму ў межах акцыі «Я першакласнік». Акцыя накіравана на сацыяльную адаптацыю дзяцей, умацаванне інстытута сям’і і стварэнне роўных магчымасцей для кожнага дзіцяці. Удзячны неабыякавым землякам, арганізацыям, якія аказалі спонсарскую дапамогу. Увага да рабят – гэта не толькі падарункі, але і іх падтрымка. У нашай краіне робіцца шмат для дзяцей,* – адзначае старшыня раённага аддзялення РГА «Беларускі дзіцячы фонд».




Як жа весяліліся і радаваліся разам са сваімі роднымі хлопчыкі падчас забаўляльнай праграмы з элементамі сучасных тэхналогій на ўтульнай «Гульнявой прасторы 23». Добры настрой стваралі валанцёры раённага аддзялення Беларускага дзіцячага фонду у роставых касцюмах казачных персанажаў «Кроша» і «Нюшы». А ўсмешкі і радасць на тварах дзяцей – лепшая падзяка дарослым за клопат і ўвагу.

#здоровые _города